

«Адкрыццё Яна», 2007 год.

■ Падзея месяца

# ДОБРЫЯ ВЕСТКІ АБ НОВЫМ ЖЫЦЦІ

## Жывапіс, што ад прыватнага накіроўвае да агульначалавечага

**Чарнобыльская катастрофа, упадак, Дабравесце. Рэалістычны ланцужок са зразумелым інтэртэкстам пранізвае жыццё і, як вынік, персанальную выставу беларускага імпрэсіяніста Лявона Грышука. 20 ліпеня экспазіцыя пленэрных пейзажаў «Дабравесце» адкрылася ў Палацы мастацтваў сярод іншых экспазіцый юбіляраў. Біблейскі матыў, што кажа пра шчаслівую вестку аб збаўленні чалавечага роду ад граху праз пакуты Божага Сына, тлумачыцца тут у больш «зямным» сэнсе. Дабравесце — як пазбаўленне ад трывалага болю і пераход да новага жыцця. Можа, без ахвяр, без абвяшчэння аб выратаванні, без дзівосаў. Але ў рэальным жыцці, з чалавечай сілай духу, жаданнем жыць... і ўсё ж з Евангеллем і дакладна з Богам.**

Сёлета споўнілася трыццаць гадоў з часу катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, мы сталі сведкамі доўгага шэрагу прысвечаных аварыі мерапрыемстваў. Водгаласы яе адзываюцца не толькі ў юбілейныя даты, не толькі ў наш 2016-ы, а кожны дзень і нават кожную хвіліну. Натуральна, у агульныя тэндэнцыі, асаблівасці беларускага выяўленчага мастацтва можна ўключыць рэфлексію на чарнобыльскія падзеі, тэмы страчанасці, закінутых земляў, жаху, прадчування катастрофы. Побач з гэтай тэндэнцыяй ідзе канцэптуалізм, што перадае перажыванні аўтара праз пэўныя вобразныя знакі.

**Лявон Грышук трапіў у самае пекла катастрофы — сярод іншых ён працаваў на даху ўзарванага энергаблока, трымаў у руках радыеактыўны графіт, бачыў цэмру ўзарванага рэактара.**

Лявон Грышук, не паспрачаешся, працуе ў рэчышчы першай тэндэнцыі, але канцэптуалізм, калі мы выкарыстаем гэта слова як аўтарскі неалагізм (бо ў традыцыйным сэнсе слова канцэптуалістам мастаканазваць нельга), патлумачыць можна таксама. У свой час Лявон Грышук трапіў у самае пекла катастрофы — сярод іншых ён працаваў на даху ўзарванага энергаблока, трымаў у руках радыеактыўны графіт, бачыў цэмру ўзарванага рэактара. Кажуць, той, «хто захапляўся прыгажосцю жывога, трапіў у самы эпіцэнтр разбурэння, якое несла смерць». Несправядлівыя аксюмараны жыцця. Удзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы абярнуўся дэпрэсіяй і хваробамі — упадак. Але Дабравесце, наступны пункт ланцужка, стала сімвалізаваць збаўленне, адраджэнне, аднаўленне. І не толькі — грэх і ахвяры ў гэтай адсылцы іграюць таксама. Бо сама катастрофа — ёсць праява чалавечага граху і хіб цывілізацыі, якая аддае нам даброты, а ўзамен патрабуе пагадненняў з сумненнем. І ахвяры — хваробы, гады пакут — трэба было прынесці, каб нарэшце «прыйсці ў норму» альбо гучней — атрымаць добрую вестку аб збаўленні.

Дык вось канцэпцыя творчасці Лявона Грышука. Мастак убачыў утылітарныя, урбаністычныя віды Чарнобыльскай АЭС, створаныя чалавечымі рукамі магутныя збудаванні, адчуў маўклівы, нечалавечы, жудасны подых узарванага рэактара, але адказаў гэтым успамінам прыродай, пейзажамі, вобразамі, жывымі краявідамі.

Тым не менш жывая прырода, якая па вызначэнні рухаецца і гучыць, у Лявона Грышука статычная альбо павольная, нямая і насцярожаная. Пакутлівая. Так невідавочна спалучэнне жывога і мёртвага маецца на ўвазе, пачынае кантактаваць і адзывацца бязрадасным узаемадзеяннем. Мастак часта працуе на адкрытай прасторы, выязджае на пленэры ў розныя мясціны. А тое, што адлюстроўваецца на палатне — усё роўна нагадвае пра нешта незваротна страчанае, хай гэта моманты з дзяцінства, закінутыя вёскі, забытыя прасторы ці непасрэднасць уражанняў, якая некалі была такой натуральнай. У кожнага з нас.

**За цёмнымі і светлымі, размытымі, вобразамі на палотнах аўтара не толькі свае прывіды, але асэнсаванне агульнага шляху.**

Насамрэч, збаўленне, што стаіць за Дабравесцем, тут таксама павінна быць умоўным. Гледзячы на пласт работ, прысвечаных катастрофе, што пакінула груваскі адбітак на жыцці аўтара, зразумела — абсалютнае выратаванне не прыйдзе ніколі, ды і абсалютаў не існуе, памятайце ж.

**Сама катастрофа — вынік чалавечага граху і хіб цывілізацыі, якая аддае нам даброты, а ўзамен патрабуе пагадненняў з сумненнем.**

І яшчэ: нават вельмі асабісты жывапіс Лявона Грышука мае на ўвазе перажыванні не аднаго чалавека. Дабравесце ў Евангеліі прагучала для ўсяго чалавецтва. Катастрофа на АЭС шакіравала ўсю планету, грэх, ахвяры, збаўленне — актуальныя для кожнага. За цёмнымі і светлымі, размытымі, вобразамі на палотнах аўтара не толькі ўласныя прывіды, але асэнсаванне агульнага шляху. Катастрофа — упадак — дабравесце. Універсальная формула, і апошні пункт у ёй непазбежны.

«Я імкнуся паказаць, што выратаванне ёсць — яно з Богам, і ёсць іншае жыццё, не толькі зямное», — кажа аўтар. Гучыць з першых вуснаў таго, каму давялося стаць ліквідатарам наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Гучыць жыццесцвярджальна. Бо пад іншае — незямное — жыццё кожны можа падставіць свае варыянты. Нават калі гэты варыянт — новае жыццё з панядзелка.

Выстава «Дабравесце» будзе працаваць у Палацы мастацтваў да 8 жніўня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*